## Касьцёл і Калегіюм Езуітаў у Наваградку

Касьцёл у Наваградку ўжо даўно не існуе. Не захаваліся аніякія выяўленчыя матэрыялы, ані праекты, ані абмеры, ані віды з касьцёлам. Апісальныя крыніцы таксама вельмі скупыя. Няма аніякіх апісаньняў, ані інвэнтароў, не захаваліся ані кантракты з выканаўцамі, ані справаздачы рэктароў пры ўступленьні, ці г.зв. рэсыгнацыі. Засталася адно гісторыя калегіюма, што пісалася па бягучых справах і адсылалася ў Рым звычайна раз на тры гады. На падставе той адзінай крыніцы паспрабую высветліць падзеі, што спадарожнічалі пабудове касьцёла ды кшталт касьцёла. [1]

### 1. Тагачасныя будынкі

Першапачаткова наязджалі зь Нясьвіжа і на запрашэньне пробашча Марціна Градоўскага рабілі казаньні ў Наваградзкай фары. У 1623 г. Ян Галаўня, харужы наваградзкі, запісаў ім вёску, а ягоная жонка Ганна з Кавэнчынскіх адпісала 10 тыс. Флорэнаў, з якіх дае 700 на год. Каля 1626 г. Ян Машынскі даў 5 тыс. За пакупку пляцу і ўласным коштам збудаваў драўляны дом і касьцёл. Адтуль езуіты замяшкалі ў Наваградку на стала. З 1631 г. ўжо існуе афіцыяльная рэзыдэнцыя.

У 1644 г. пробашч наваградзкі, канонік віленскі Марцін Градоўскі даў шчодрую ахвяру на пабудову мураванай школы. Пра саму пабудову школы хранікёр не прыгадвае. Толькі ў 1650 г. цягам двух месяцаў былі збудаваныя скляпеністая піўніца, удаўжкі на дванаццаць сажняў, ушыркі на чатыры (каля 21,6 х 7,2 м.), на якой пачалі ўзносіць памяшканьні для езуітаў за кошт пробашча Градоўскага. Дадаў яшчэ 8 тыс. на сканчэньне той пабудовы. Ужо пастаўлены дах, дзе, калі ў верасні 1655 г. ўварваліся казакі. Спалілі касьцёл і драўляны дом, ацалеў дом мураваны. У 1657 г. на жаданьне грамадзтва пастаўленая капліца у калідоры. Таксама перакрытыя скляпеньнямі пакоі і калідор на паверсе.

У 1662 г. біскуп уніяцкі Габрыэль Календа перадаў езуітам разбураны касьцёл грэцкага абраду з вёскі Рута, які быў перанесены да места, адрамантаваны і перададзены для ўжытку 8 сьнежня Руская ікона Маці Божай Дасканалай, ахвраваная калісь праз прэлата віленскага Крыштапа Прэцлаўскага, была ўрачыста перанесеная да касьцёла. Той жа Прэцлаўскі, паміраючы ў 1675 г. ўфундаваў аркестр, для якога побач з касьцёлам была пабудаваная драўляная вежа. У 1676 г. была збудаваная драўляная сталовая і кухня, а таксама дом для служкаў і гаспадарчыя будынкі.

### 2. Пабудова касьцёла

Пасьля спусташэньняў маскоўскай вайны доўгім часам не было заможных фундатараў. Старыя папаміралі, мншыя былі больш сьхільныя да ўзяцьця, чым да аддаваньня.Хтосьці абяцаўся запісаць езуітам цэлы маёнтак, але нечакана памёр без тэстаменту. Нарэсьце Багуслаў Уняхоўскі, пісар земскі наваградзкі і маршалак трыбуналу з жонкай Барбарай з Дунінаў узяўся фінансаваць пабудову мураванага касьцёла. Сьпярша даў фундуш на

пабудову цагельні і нарыхтаваньне матэрыялаў, потым умураваў вуглавы камень. Асьвяціў яго віленскі біскуп Канстанцін Бжастоўскі ў дзень 26 VII 1687 г. Касьцёлу была дадзеная назва Бязгрэшнага зачацьця Найсьвяцейшай Панны Марыі і сьв. Барбары.

На шчасьце, хутка паказаўся цьвёрды грунт, і падмуркі стала мажлівым закладаць без глыбокіх раскопаў. За 9 тыдняў вывелі іх да паверхні зямлі, а з боку вуліцы ўзьнесьлі муры ў 5 лакцёў над зямлёй. Не будавалі толькі тую частку, што мелася прахадзіць праз стары (драўляны) касьцёл. Новы касьцёл меўся стаяць на дзесяці слупах. У 1691 г. заскляпілі прэзьбітэр і дзьве сакрыстыі, далей перанесьлі са старога касьцёла абраз Маці Божай і труны езуітаў, пасьля чаго стары касьцёл разабралі, бо перашкаджаў будаўніцтву сьцяны новага. У 1692 г. заскляпілі далейшую частку касьцёла. У наступным месяцы забракавала цэглы, з прычыны чаго ўсе сілы і фундушы былі зьвернутыя на загатоўку матэрыялаў. Вялікая колькасьць нагатаванай цэглы дазволіла шпарка будаваць у 1695 г. Тады збудавалі фасад зь дзьвюма вежамі з боку вуліцы. На жаль, працяглыя буры і дажджы затрымлівалі працы і не дазволілі давесьці іх да канца. Скончылі іх у наступным годзе, для чаго зноў зьбіралі цэглу і вапну. У 1697 г. скончаныя муры абедзьвюх сакрыстыяў (відавочна, вядзецца пра паверх па-над імі), галоўная нава ўзьнесеная на вышыню дванаццаці лакцёў (7,2 м.). Левая сьцяна касьцёла ўзьнесеная аж да даха, правая скончаная толькі ў 1699 г. У 1700 г. памёр фундатар Багуслаў Уняхоўскі. У 1701 г. дах касьцёла пакрыты дахоўкай, збудаваныя скляпеньні і пахавальная крыпта, над якой паставілі вялікі альтар. Гэтаксама былі павялічаныя і абгароджаныя мурам прыкасьцельныя могілкі. З гэтай мэтай была перасунутая грамадзкая вуліца і перанесеныя два будынкі (драўляныя). У 1702 г. атынкавалі і пабялілі вонкавыя сьцены, вежы дабудавалі да вышыні больш за 30 локцяў (каля 20 м.) і накрылі драўляным дахам. Адначасова ставіліся альтары. Альтар сьв. Ігната з новымі абразамі ўфундаваў айцец Фэліцыян Вароніч, на той час прэфект будаўніцтва. Альтар студэнцкай Кангрэгацыі фундаваў Геранім Вольскі, чашнік рэчыцкі. Трэці альтар, сьв. Праньцішка Ксавэрыя, паўстаў за кошт фундатаркі касьцёла Барбары Ўняхоўскай, якая ў 1703 г. выйшла за Міхала Патоцкага. Глыбокі калодзеж, выкапаны каля касьцёла на могілках, меўся адвадзіць ваду з-пад зямлі і дастаўляць яе для патрэбаў будаўніцтва. У 1703 г. былі пабудаваныя музычныя хоры, пакрытыя бляхай абедзьве вежы, усталяваныя крыжы на вежах і на шчыце фасаду. У 1704 г. вецер сарваў шаломы вежаў, якія, падаючы, прабілі дах касьцёла. Дах адрамантавалі ў тым жа годзе. Апроч таго, у касьцёле ўсталявалі лавы і краты на музычных хорах. У 1705 г. вежы наноў пакрылі бляхай, а ўнутры касьцёла ўсталявалі балюстрады (cancelli) па абодвух баках навы дзеля перавагі езуітаў пры слуханьні казаньняў (напэўна, на эмпорах).

У 1706 г. фундатары (Патоцкія) атрымалі ад генерала ордэну дыплём дапушчэньня да заслугаў ордэну, што пабудзіла іх да большай шчодрасьці. Хутка гэтак збудавалі портык (сенцы касьцёла), пакрыты белай бляхай, досыць шырокі і высокі, які стаў аздобай места. У тым жа годзе скончылі

аздабленьне фасадаў. Пабудавалі таксама пахавальную крыпту для Кангрэгацыі Добрай Сьмерці, а таксама драўляны крыты ганак з касьцёла да рэзыдэнцыі. У 1707 г. за кошт фундатараў справілі прыгожы амбон. У 1709 г. паставілі альтары: Хрыста Ўваскрослага, сьв. Міхала Арханёла, сьв. Барбары, сьв. Юзафа і сьв. Казімера – усе пазалочаныя. Удзень 22 VI 1710 г. рэзкі парыў ветру сарваў высокія шаломы абедзьвюх касьцёльных вежаў. Адбудавалі іх і пакрылі бляхай у 1712 г. У 1715 г. адрамантавалі дахі на касьцёле і сакрыстыях, якія працякалі. Нарэсьце, 23 VIII 1716 г. біскуп Канстанцін Бжастоўскі кансэкраваў касьцёл (той жа самы біскуп амаль 30 гадамі раней асьвяціў вуглавы камень). Назва касьцёла: Дасканалага Зачацьця Найсьвяцейшай Панны Марыі, а таксама сьв. Юзафа і сьв. Станіслава Косткі.

У 1719 г. памерла фундатарка касьцёла і калегіюма Барбара з Дунінаў, у першым шлюбе Ўняхоўская, у другім – Патоцкая. Пахавалі яе ў сутарэньня’ касьцёла.

Для асушэньня падмуркаў пад касьцёлам выкапалі калодзеж і ваду, што зьбіралася ў ім, адводзілі каналамі ў другі калодзеж па ўсходнім баку ад касьцёла. У 1720 г. на могілках пабудавалі новую вежу для трубачоў, што гралі на сьвята Маці Божай.

Аляксандр Корсак, падчашы і пісар гродзкі наваградзкі ў 1722-23 г.г. перабудаваў галоўны альтар і справіў да яго табернакулюм. У 1723 г. нейкі Юневіч ўфундаваў альтар Зьвеставаньня для Кангрэгацыі. У 1727 г. адрамантавалі дахі (над бакавымі навамі, крытыя гонтам), пабялілі сьцены ў інтэр’еры і пазалацілі альтар Кангрэгацыі, а ў наступным годзе таксама і галоўны. У 1732 г. прывезьлі празрыстыя шыбы з Радзівіллаўскай мануфактуры ў Налібаках (незвычайная навіна па тых часох), і ашклілі два вакны пры галоўным альтары, у 1734 - вакно над музычнымі хорамі, а ў 1736 – вокны ў сакрыстыі. У 1734 г. заклалі новыя шаломы на касьцёльных вежах і пакрылі іх жалезнай бляхай. У 1749-50 г.г. паставілі мураваную агароджу вакол прыкасьцёльных могілак.

Удзень 3 VI 1751 г. пажар зьнішчыў усю аздобу касьцёла: альтары, арганы, званы, гадзіньнік, вежы, а таксама бібліятэку, якая месьцілася над сакрыстыяй. Былі ўратаваныя найкаштоўнае начыньне, абраз Маці Божай і распяцьце. Сьпешна адбудоўвалі дахі, каб працяглыя дажджы ня сталіся прычынай абрушэньня скляпеньняў. Патрэбнае для таго дрэва дала Радзівіллаўна, удава па ваяводзе наваградзкім. [3] Тым часам набажэнствы адпраўлялі ў вялікай школьнай сталовай. У 1752 г. дах касьцёла быў пакрыты дахоўкай, збудавалі новае скляпеньне ў месцы аслебленага пажарам, атынкавалі сьцены. Пастаыілі лавы, альтары, амбон, адлілі новы звон вагай у 70 камянёў і завесілі на вежы. З пачаткам лістападу скончылі касьцёл і перадалі для ўжытку.

На жаль, у 1753 годзе трэба было пачаць рамонт ад пачатку, бо аслабленыя цяжарам мураваных арак сьцены касьцёла ўжо пагражалі абрынуцца. Гэтак зьнялі дах і скляпеньні, а сьцены ўзмацнілі вялікай колькасьцю жалезных анкераў, што мелі падтрымліваць скляпеньне.

Прывезьлі з Караляўца арганы за 500 тынфаў, справілі срэбныя рамы для абраза сьв. Тадэвуша, новыя канфэсыяналы і завесілі на вежы новыя званы, што важылі адзін 40, другі 16 камянёў. Закупілі таксама ў Курляндыі 30 вазоў гіпсу для аздабленьня мураваных альтароў. Марцыян Храптовіч даў яшчэ 10 вазоў гіпсу на альтар Сьвятога Крыжа, пад якім хацеў збудаваць радавую пахавальню. Ягоны брат, Ян Храптовіч, даў 60 злотых на пабудову альтара сьв. Яна. У 1754 г. на арках, змураваных за папярэдні год, заклалі новае скляпеньне, атынкавалі яго і пабялілі. Далей пачалі ставіць альтары. У прэзьбітэрыюме ўсталявалі тры: галоўны і два меньшыя па абодвух баках, мураваныя і пакрытыя размаляваным гіпсам, які капіяваў розныя віды мармуру. Паставілі да іх абразы сьв. Яна Эвангеліста і сьв. Ігната, абодва добра намаляваныя. У сярэдняй наве паклалі падлогу з каменя, прывезенага з Караляўца. На інаўгурацыю Трыбуналу аддалі пад ужытак галоўную наву, бо датуль адпраўлялі набажэнствы ў наве бакавой.

У 1755 г. зьнялі два верхнія паверхі касьцёльных вежаў, бо тыя не прыстасаваныя для пад’ёму большага цяжару, а на іх месцы збудавалі новыя, лепшай формы, умацаваныя жалезнымі анкерамі. На іх пабудавалі высокія вежы з шаломамі (ужо пятымі), цалкам мураваныя, аздобленыя крыжамі і пакрытыя бляхай. Дахі бакавых наваў пакрылі дахоўкаю. Да галоўнага альтара і двух бакавых дадалі гіпсавыя фігуры сьвятых і анёлаў, а таксама іншыя разныя дэкарацыі, месцамі пазалочаныя. Да таго збудавалі шэсьць новых альтароў: сьв. Станіслава Косткі для студэнцкай Кангрэгацыі, Хрыста Ўкрыжаванага, сьв. Яна Непамуцкага, сьв. Юзафа, сьв. Міхала і сьв. Яўхіма, кожны быў фундаваны праз іншага дабрадзея. У наступным годзе тыя альтары пакрылі стукам, аздобілі разьбой і абразамі. Збудавалі ад падмуркаў мураваныя сенцы, накрытыя дахам з бляхі, што мелі гаўбец (odaeum) для музыкаў, якія ў сьвяточныя дні гралі на трубах (ён замяніў даўнюю вежу, што стаяла асобна). У галоўным альтары паставілі дзівосны табернакулюм, насамрэч драўляны, але аздоблены золатам, срэбрам і крыштальнымі калюменкамі. У 1757 г. павялічылі пахавальныя крыпты, зрабілі ў іх вентыляцыйныя вакенцы з адваднымі каналамі. Справілі новы драўляны амбон, аздоблены росьпісам і пазалотай, з абразамі, фігурамі і арнаментальнай разьбой. За кошт Валадковіча прывезьлі з Караляўца каменьне на падлогу перад альтаром Сьвятога Крыжа. У 1758 г. італьянскі маляр пакрыў інтэр’еры касьцёла ілюзыяністычнымі росьпісамі “(parietes ad regulas optices a pictore Italo coloribus inducti)”, а на сьценах завесілі восем вялікіх абразоў на палатне, што рэпрэзэнтавалі сцэны з жыцьця Маці Божай.

У 1768 г. ўсе вонкавыя сьцены касьцёла наноў атынкавалі, дах пакрылі новымі дахоўкамі, зьнялі аркі, што сваім цяжарам пагражалі скляпеньням, і замянілі іх драўлянымі. [4] У 1769 г. касьцёльныя вежы пакрылі медзянай бляхай, купленай у Гданьску. На вежы зьмешчаны гадзіньнік, што выбіваў гадзіны, бачны з места. Разбурылі старую капліцу і заклалі падмуркі новай (невядома дзе).

### 3. Пабудова Калегіюма

Як згадана вышэй, першапачаткова езуіты мяшкалі ў драўляным будынку. Мураваную рэзыдэнцыю збудавалі ў 1650-1657 г.г. У 1676 г. да яе адбудавалі драўляную сталовую і кухню. Пад 1699 г. занатаванае будаўніцтва гадзіньнікавай вежы на рэзыдэнцыі, пэўна таксама драўлянай, хоць хранікёр гэтага не адзначыў.

Барбара з Дунінаў, якая па сьмерці мужа, Багуслава Ўняхоўскага, выйшла паўторна замуж за Міхала Патоцкага, падстолія літоўскага, ў 1703 г., абяцалася збудаваць калегіюм, як толькі сытуацыя ў краі дазволіць на тое. Удзень 12 XII 1705 г. выставіла дакумант фундацыйны, які прызначаў апісаныя вёскі на ўтрыманьне калегіюма. [5] Толькі ў 1709 г. закладзеныя падмуркі, а ўжо ў наступным годзе памёр Міхал Патоцкі, што зноў затрымала працы. Толькі ў 1713 г. на тых падмурках збудавалі тры жылыя пакоі і дамок са спавядальняй. Скончылі іх у 1716 г., а ў наступным годзе надбудавалі паверх.

У 1714 г. генерал ордэну ўзьняў рэзыдэнцыю да годнасьці калегіюма і ейнага кіраўніка Казімера Дэлявальле менаваў першым рэктарам. У 1719 г. памёрла фундатарка і праца зноў перарвалася.

Другую частку калегіюма разам з аптэкай пачалі будаваць у 1725 г. У 1734 г. скончылі калідоры ніжні і верхні, бо будынак быў павярховы. Зьмяшчаў шэсьць жылых пакояў і залю для клерыкаў. Далейшая частка, у кірунку касьцёла, будавалася ў 1735-38 г.г. Яна таксама была павярховайю Тут месьцілася дамавая капліца, чыё скляпеньне размаляваў нейкі езуіт “(pictum per nostrum religiosum)”. Да той новай часткі перанесьлі таксама аптэку.

Іншая частка была пабудаваная ў 1742-45 г.г. Найперш паставілі вялікую сталовую, што будавалася пяць месяцаў, яе перадалі для ўжытку ў дзень сьв. Праньцішка Борджыя, ці 30 IX 1742 г. У наступным годзе збудавалі кухню, сьпіжарню і памяшканьне для службы. Пры ўсталяваньні бровара і пякарні былі выкарыстаныя глыбокія падмуркі. Далей надбудавалі два паверхі, што мелі па чатыры пакоі, а над сталовай – бібліятэку, залю для клерыкаў і два пакоі. З боку сталовай зьмяшчаліся ўсходы на паверхі. Усё гэта скончылі ў 1745 г. У 1747 г. на ніжнім калідоры паставілі вокны.

У дзень 3 V 1751 г. ад жыжкі з кухоннага коміну запаліўся дах. Пажар хутка аб’яў усе дахі, распаўсюдзіўся на касьцёл і места. У калегіюме згарэла аптэка і колькі пакояў, астатнія атрымалася абараніць. Яшчэ ў тым жа самым годзе адбудавалі дахі, каб абараніць скляпеньні. У 1753 г. дахі пакрылі дахоўкаю. На верхнім калідоры вырабілі скляпеньне “schemate meliori” напэўна, моднае па тых часах жаглястае скляпеньне. Новыя вялікія вокны зашклілі рамбічнымі шыбкамі, адрамантавалі і заскляпілі выпалены пакой. Адрамантавалі гадзіньнік і разам з цымбаламі зьмясьцілі ў новай драўлянай вежы. У 1754 г. зьнялі мураваныя аркі, што падтрымлівалі дах калегіюма каля сталовай, а на іх месцы ўсталявалі драўляныя падпоры (напэўна, звычайныя кроквы). [6] У частцы калідора перад бібліятэкай толькі зараз паставілі скляпеньне, бо датуль стрымлівала шырыня гэтага месца.

Відавочна, што калідор у тым месцы быў шырэйшым. У тым жа годзе заклалі падмуркі пад яшчэ адну частку калегіюма “у баку школы”.

У наступным годзе дзеля лепшай абароны ад пажару, сьцены з таго боку вымуравалі аж да даха.

У 1756 г. замалявалі сталовую і аздобілі партрэтамі фундатараў і генералаў ордэну, а таксама збудавалі печ, але ў 1761 г. зьмянілі сыстэму ацяпленьня і пад сталовай зьмясьцілі бровар і пякарню. Амаль непарыўны вагонь ацяпляў залю праз спэцыяльныя каналы, якія на лета зачыняліся.

Паблізу калегіюма стаялі гаспадарчыя будынкі і школа, шматкроць зьнішчаная і адбудаваная. Напраўду, ужо ў 1645 г. суседнія пробашчы далі фундуш на будаўніцтва мураванай школы, аднак яе ніколі не збудавалі. Хранікёр пад 1660 г. натуе, што нядаўна збудаваная школа – зьнішчаная. Яе, напэўна, хутка адбудавалі, зноў з дрэва. У 1710 г. рэзкі парыў ветру ня толькі зваліў касьцёльныя вежы, але і развараціў школу, якая праз год была адбудаваная ў лепшым кшталце (forma augustiore). У 1731 г. толькі наноў збудаваная школа ўжо пагражала абрынуцца. Яна мела вежы сьпераду і ззаду, а на вежах – альтаны. Па абодвух бакох меліся дзьве школьныя залі, а сярэдзіну займаў шырокі калідор, які служыў таксама для пастаноўкі драмаў. Па пажары касьцёла ў 1751 г. школьны калідор замянілі на часовую капліцу. Напраўду, раней ужо намяраліся будаваць мураваную школу і ў 1747 г. была нарыхтаваная адпаведная колькасьць матэрыялаў, аднак да будаўніцтва не дайшло. Пад 1761 г. хранікёр занатаваў, што драўляная школа была ў вялікай небясьпецы, калі гарэлі пабудовы Баніфратаў, якія ад езуітаў адзьдзяляла толькі вуліца. Вагонь выйшаў з кляштара Базыльянак, зьнішчыў касьцёл і кляштар Базыльянаў, касьцёл, кляштар і ахвіцыны Баніфратаў, парафіяльны касьцёл і плябань, замкавую царкву і архіў ваяводзтва, складзены ў ёй, шпіхлер ваяводы і шмат іншых дамоў. Езуіцкія будынкі тады ацалелі. А школа аж да самага скасаваньня ордэну засталася драўлянай.

Паблізу ад калегіюма на краі мескага ўзгор’я ў 1764 г. паставілі вятрак. У 1704 г. збудавалі канвікт для шляхецкай моладзі, напэўна, драўляны.

Адзіны мураваны будынак на гаспадарскім падвор’і - ўзьведзены ў 1758-62 г.г., дый тое на краі ўзгор’я. Ён меў тры паверхі, але ніжняя частка была амаль засыпаная з боку падвор’я, а адкрытая з боку агароду. Унізе зьмяшчалася кузьня, сталярная майстэрня і розныя склады, вышэй – кравецкая майстэрня, бурсы музыкаў, гасьцявыя пакоі, яшчэ вышэй – шпіхлер. У 1763 г. пачатае будаўніцтва мураванай стайні.

Не захавалася гісторыя за 1770-1773 г.г.

## 4. Далейшыя лёсы

Па скасаваньні ордэну ў 1773 г. паезуіцкія будынкі перайшлі ў грамадзкую ўласнасьць. Прысланыя люстратары склалі інвэнтар [7] і, напэўна, далучылі да яго плян усяго ўчастку. На жаль, плян не захаваўся. Зь інвэнтара даведваемся, што калідор у гмаху быў наноў заскляпёны ў 1772-83 г.г. Пры ім было восем пакояў, зь якіх толькі тры жылыя, а астатнія пяць, усе на паверх, – яшчэ ня скончаныя, безь дзьвярэй, пячэй і падлогі. З боку

кухоннага крыла паўсталі новыя муры пачатай школьнай актавай залі. Тыя будаўнічыя працы былі распачатыя незадоўга да скасаваньня ордэну і ніколі не былі скончаныя. Пра стан будынкаў у пазьнейшыя часы маем толькі скупыя зьвесткі з рапартоў візытатараў школ. У васьмідзясятых гадох яны паведамляюць, што будынкі ўжо доўгім часам патрабуюць рамонту і згадваюць пра дадатковы фундуш дзеля гэтых мэтаў. Праньцішак Бяньկоўскі ў 1782 г. піша:

Дахі патрабуюць пастаяннага рамонту з прычыны дрэннага матэрыялу, гліны, што сыпіцца. Тое ж тычыцца касьцёла. Палажэньне места, што стаяла перад пастаяннымі нападамі і раней пастаянна патрабавала рукі рамесьніка, а тынкі, што даваліся з розных прамысловасьцяў, ніколі не маглі ўтрымацца; асабліва з заходняга боку, што выдаецца бачыць на шмат якіх наваградзкіх хвабрыках.

Дадае, што

ў дзьвюх асобных ахвіцынах, што стаяць на чалядным падвор'і адбываюцца школы.

Давід Пільхоўскі ў 1786 г. даносіць, што

касьцёл набліжаецца да руіны, тынк, карнізы адпадаюць, дах працякае, абразы ў альтарох гніюць празь вільгаць.

А Ян Эрдман у наступным годзе:

Касьцёл, што да дахаў, добра стаіць, але тынк на фасадзе і карнізы адпадаюць, унутры празь вільгаць папсаваліся аьразы, у вадной ахвіцыне, што завецца шпіхлерам, месьціцца школа. [8]

Напэўна, вядзецца пра той мураваны будынак, наверсе якога быў шпіхлер. Усе астатнія будынкі вымагалі працяглага рамонту і былі ў куды горшым стане.

У 1795 г. Наваградак трапіў пад панаваньне Расеі. Адразу ж расейскі маёр зладзіў абраньне магістратам мерніка, які б склаў плян места. [9] Плян той быў скончаны ў 1798 г., захаваўся ў Маскве. Тое ёсьць адзіным плянам места, на якім пазначанае палажэньне касьцёла. У 1797 г. школу перадалі пад кіраваньне дамініканаў і, праўдападобна, перанесьлі будынак да іх. [10] Касьцёл стаяў яшчэ ў 1802 г., бо тады зь яго вежы зьнялі званы і адаслалі да Вільні да касьцёла сьв. Казімера. [11] Потым касьцёл прызначылі да разборкі, а ягоную цэглу ўжылі на будаўніцтва крамаў і корчмаў на рынку. [12] Дакладна невядома, калі ён зьнік з паверхні зямлі, але ў любым разе гэтак рана, што ня трапіў ні на які малюнак.

### 5. Спроба аднаўленьня будынкаў

Падставай для аднаўленьня ёсьць: інвэнтар 1774 г., плян места 1798 г. і два абмерныя малюнкі толькі самога калегіюма. Езуіцкі комплекс займаў прадоўгаваты ўчастак, што цягнуўся ад рынку на ўсход, між вуліцай Траецкай з поўдня, а з поўначы вуліцай, што ішла ярам ля падножжа замкавай гары. Заходнюю частку займалі шырокія могілкі з касьцёлам, што стаяў вольна, пасярэдзіне ўчастка стаяў калегіюм, які цягнуўся з поўдня на

поўнач, амаль ад вуліцы да вуліцы; нарэсьце, усходняя частка зьмяшчала шырокае падвор'е з гаспадарчымі будынкамі.

Касьцёл задакумэнтаваны найслабей. На пляне места ён намаляваны вельмі павярхоўнасна, у інвэнтары апісаны недастаткова, трэба дапамагчы сабе згадкамі ў езуіцкай хроніцы. Касьцёл быў арыентаваны заходнім фасадам да паўночнага кута рынку. Меў дзьве вежы, крытыя бляхай, а на іх два звані і гадзіньнік.

Перад фасадам – мураваны ганак, крыты дахоўкай, над якім укола ганак, апасаны аздобнымі жалезнымі кратамі.

Тое быў гаўбец для музыкаў, пакрыты ў 1756 г. бляшаным дахам. Інвеэнатр згадвае "у ганку трое дзьвярэй, адныя – вялікія падвойныя […], … з ганка ўваходзячы ў касьцёл – вялікія падвойныя дзьверы, "а далей – дашчасты прысенак, для аховы ад ветру, размаляваны, з тройкай дзьвярэй. Пасьля таго … вопісу ўваходу сьледуе сумарны вопіс нутра: мураваны хор, адзінаццаць "альтароў з аздабленьнем гіпсатурай", шэсьць канфэсыяналаў разьбярскай работы, а чатыры – сталярскай работы", вялікіх маляваных лавак – шэсьць штук, у якіх штуках лавак трыццаць чатыры, перад вялікім альтаром – жалезныя краткі разьбярскай работы". Падлога мармуровая. Ува ўсім касьцёле вокнаў з жалезнымі кратамі – чатырнаццаць і яшчэ чатырнаццаць бяз аратаў. Па абодвух бакох вялікага альтара дзьве сакрыстыі, левая – зь цёмным прысенкам, без вакна. Дах на касьцёле пакрыты дахоўкай.

Зь інвэнтара не вынікае, якім быў кшталт касьцёла. Згадка ў хроніцы пад 1687 г., што касьцёл мусіў трымацца на дзесяці слупох дазваляе дадумаць, што ён быў трохнававы, шасьціпралётны. Істнаваньне бакавых наваў пацьвярджае іншая згадка пад 1716 г., яна кажа, што капліцу сьв. Станіслава Косткі пакрылі новым дахам на даўжыню чатырох касьцёльных вокнаў. Гэта значыць, што "капліца" азначае ў дадзеным выпадку бакавую наву. Падобныя словы пра пакрыцьцё даха капліцаў ёсьць за 1751-1754 г.г., калі ў галоўнай наве ставілі новае скляпеньне, а потым клалі падлогу, набажэнствы адбываліся ў капліцах (in sacellis) ці ў бакавых навах.

Згадкі з 1704-05 г.г. пра закладаньне кратаў на музычных хорах і па бакох касьцёла "(crates chorum musicorum supra et latera templi, cancelli lignei ad latera templi)" дазваляюць дадумаць, што над бакавымі навамы былі эмпоры. У той жа час няма дакладных зьвестак, ці былі якіясь памяшканьні над сакрыстыямі. Хутка сакрыстыі былі заскляпёныя ў 1691 г. а толькі шасьцю гадамі пазьней скончаныя, "што да муроў' (finita namque duo collateralia, quoad murum templi sacraria seu sacristiae)", дык можна меркаваць, што муры былі выцягнутыя ўгару, ці надмураваны паверх, але інвэнтар аніяк такі паверх ня згадвае. Вопіс будынкаў, аднак, павярхоўны і дакладна пералічвае толькі рухомыя рэчы.

З усяго вынікае, што па прасторавай будове касьцёл быў падобны да касьцёлаў у Сьвятой Ліпцы альбо ў Пултуску (IL.2). Тут не было б нічога дзіўнага, бо згаданыя касьцёлы ўзводзіліся ў адзін час. Вельмі верагодна, што тут выкарыстоўваўся шматкроць адзін і той жа праект з малымі толькі зьменамі. Напэўна, іначай выглядалі прысенак і вежы. Памеры касьцёла былі

магчыма набліжаныя да 40х70 лакцёў (24х42 м.), бо тое быў часта ўжываны памер езуіцкіх касьцёлаў.

У 18 ст. касьцёл перабудавалі. Ён тады атрымаў стукавыя альтары і мураваныя шаломы вежаў. Ня ведаем, як яны выглядалі, але, прыпушчальна, падобна да віленскіх.

Захаваліся два абмерныя малюнкі толькі самога калегіюма [13] (IL.3-4). Адзін, які рэпрэзэнтуе трохпавярховы фасад, мае тытул: "Калегіюм, бачны з паўночнага боку ад яра" і падпісаны "1817 г. дня 28-га (бязь месяца) на месцы маляваў Ян Шантыр, геаметра Віленскага Унівэрсытэту". На другім малюнку ўгары ёсьць надпіс "Плян паезуіцкіх муроў, якія маюцца у м. Наваградку. 10 лютага 1831 г. праверaныя". Унізе подпіс "Пульхоўскі" і маштабная лінейка ў літоўскіх лакцёх. Малюнак рэпрэзэнтуе плян першага паверха калегіюма і яго ўсходні фасад, а таксама плян шпіталя баніфратаў. У калегіюме галоўны корпус, які ідзе з поўначы на поўдзень і кароткае паўднёва-ўсходняе крыло – "пакоі, занятыя генералам". У паўднёва-заходнім крыле – аптэка. Паўднёва-заходняе крыло ў стане руінаў. Прыпіска паведамляе, што яго разабралі. Паўночна-ўсходняе крыло – гэта, напэўна, даўняя сталовая, занятая пад генеральскую стайню. На ёй прыпіска: "сьцены драўляныя". На малюнку фасада тая частка ўжо бяз даха і без паверха. Прыпіска з паўночнага боку сталовай "падмурак на чатыры лакці". Параўнаньне з больш раньнім малюнкам паказвае, што "падмурак" азначае сьцяну падземнага паверха, што адыходзіць ад той "драўлянай сьцяны", бо пляцоўка мела ўхіл. Прыпіска ў верхнім левым куце: "другі паверх" азначае, што тое – плян другога паверха. Гэта значыць, што аптэка месьцілася на другім паверсе, і да яе вялі ўнутранныя сходы.

Вышэйапісаныя малюнкі стасуюцца зь інвэнтарным опісам 1774 г. Двухпавярховы будынак калегіюма быў зьвернуты фронтам да гаспадарчага падвор'я, ці на ўсход. Уваход з падвор'я вёў на калідор у паўднёва-ўсходнім крыле, у якім было чатыры жылых пакоі. Пяты быў "у куце пры канцы аптэкі" ці на пачатку паўднёва-заходняга крыла. Пры галоўным калідоры было восем пакояў і дзьве лесьвічныя клеткі на абодвух канцох. У паўночным крыле з боку сталовай была кухня, кухонны пакой, дыспенса (ці сьпіжарня), пакой і "месцы патрэбныя". Пад тым крылом – чатыры скляпы, пад сталовай – бровар і пякарня. На другім паверсе – тая ж колькасьць памяшканьняў. З боку аптэкі была "вялікая драўляная капліца, скляпеньні зламаныя". У суседнім пакоі, што належаў да аптэкі, на той час была складзеная бібліятэка. Над сталовай – доўгі пакой, прыстасаваны пад бібліятэку. Над кухняй і прылеглымі памяшканьнямі – шэсьць жылых пакояў.

Зь ніжняга вялікага калідора яшчэ ёсьць выхад безь дзьвярэй на малы квадратны (чатырохбаковы) двор, на якім пры калідоры, які належыць да аптэкі, зь левага боку вялікі гадзіньнік з двума званамі, які выбівае гадзіны і квадрансы; у той час пры правым баку новы мур двух пакояў з альковамі і вялікай залі для публічных школьных Экспэрымэнтаў лучыцца са старым,

выведзены з падмурка вышэй вакна. Ад таго мура ў квадрат да форткі – падмурак, закладзены пад будаўніцтва школы.

Тыя нясканчаныя муры не адзначаныя ні на адным пляне. Вельмі верагодна, што іх у хуткім часе разабралі.

Загадкава апісанае палажэньне памяшканьня вартаўніка ці парцьерні. Той двор, прайшоўшы дзьверы да памяшканьня вартаўніка [...] Пры іх званок, у самага памяшканьня вартаўніка два вакны [...] і дзьверы другія для выйсьця да касьцёла і на могілкі [...] з тых дзьвярэй ідучы да касьцёла – калідор не заскляпёныя [...] дзьверы да прысенка сакрыстыі.

Плян места 1798 г. паказвае аптэчнае крыло, заламанае да поўначы і злучанае вузкім калідорам з сакрыстыяй і з галоўным калідорам у калегіюме. Напэўна, там месьцілася памяшканьня вартаўніка. Магчыма, што яна была нясканчаная і праз тое хутка зьнікла, бо на пазьнейшых плянах яе няма. Прыпушчальна, што тое памяшканьня вартаўніка, а таксама падмуркі новай школы і пачатыя муры школьная актавай залі разам меліся складаць заходняе крыло будынка, якое б злучала аптэку з кухняй. Старая драўляная школа паўстала на могілках насупраць сакрыстыі ці па паўночным баку той нясканчанай актавай залі.

Гаспадарчае падвор’е цягнулася на ўсход ад калегіюма. Брама да яго вяла з вуліцы Траецкай (цяпер Менскай), ці ад поўдня. Направа ад брамы ўздоўж вуліцы стаяла доўгая мураваная ахвіцына павярховая, у якой укола месьціліся: чатыры заскляпёныя пакоі, сарай без скляпеньня для таго, каб ставіць вазкі, за ёй – млын на валовай цязе, скляпёная стайня для валоў, тры скляпёныя стайні для коняў, скляпёная вазоўня. Уся тая ахвіцына была пакрытая дахоўкай. Насупраць, з паўночнага боку падвор’я, стаяла іншая мураваная ахвіцына, што мела тры паверхі. Зьнізу месьцілася, пры заходнім канцы – два жылыя пакоі з калідорчыкам, пры ўсходнім канцы таксама два пакоі з калідорчыкам, у якіх былі сталярскія варштаты. Сярэдзіну паверха займаў “шпіхлер для захоўваньня featureзнага спрату, вялікі, скляпёны і атынкаваны”. На другім паверсе гэтаксама былі два калідорчыкі, падзеленыя мурам, пры якіх, у заходнім баку – пяць пакояў, пры ўсходнім – два вялікія жылыя пакоі. Новы дах быў пакрыты дахоўкай. Той вопіс стасуецца з паведамленьнем у хроніцы пра будаўніцтва ахвіцыны ў 1758-62 г.г. Плян першага паверха таго будынка паказаны на пляне калегіюма пад 1831 г. з надпісам “шпіталь баніфрацкі”. Пабудовы баніфратаў стаялі калісь насупраць школы зь іншага боку вуліцы, былі спаленыя ў 1761 г. Відавочна, што пазьней шпіталь быў перанесены да паезуіцкага будынка, у якім па скасаваньні ордэну нейкім часам месьцілася школа. Для патрэбаў шпіталя зрабілі большаю залю, епрасунуўшы сьцяну калідора.

За тою ахвіцынаю знаходзіўся агарод. На двары стаяла “драўляная кузбьня з мураваным комінам і печ для паленьня і гашэньня вапны”.

Захаваныя пляны калегіюма ў супастаўленьні зь будаўнічымі ведамасьцямі дазваляюць узнавіць праўдападобную чарговасьц будаўніцтва. Найперш збудавалі касьцёл (1687-1716), пры ім, па ўсходнім баку, - тагачасную рэзыдэнцыю. Праз тое мураваны калегіюм мусілі ставіць далей

на ўсход. Пачалі яго з цэнтральнай часткі, праўдападобна ў два этапы (1709-1717) і (1725-1734), пасьля паўднёвае крыло (1735-1738) і паўднёва-ўсходняе (1744-1745), пасьля паўночнае (1743-1745), у 1754 г. пачалі будаваць “у баку школы” (напэўна, паўночнае крыло да захаду). У 1757 г. разбудавалі аптэку, потым – ахвіцыну (1758-1762) і ў 1763 г. пачалі будаваць мураваныя стайні; нарэсьце, пачалі заходняе крыло (1770), якое ня скончылі (IL.5). Разьбіралі будынкі з адваротнай чарговасьцю. Найперш, няскончаныя муры заходняга крыла, потым касьцёл (1802). Паўночнае крыло стаяла яшчэ ў 1817 г., але перад 1831 г. і яго разабралі. Пакрокава разьбіралі далейшыя часткі, гэтак, што толькі малы фрагмэнт зь іх стаўся ўключаным у новую забудову.

Хроніка не натуе імёнаў мастакоў, а з асабістых каталёгаў вынікае, што там не было езуіцкіх мастакоў – ані дойлідаў, ані разьбяроў, ані маляроў. Былі адно сталяры, але няма ведамасьцяў пра сталярскія працы за той час. Таму езуіты мусілі наймаць сьвецкіх мастакоў. Там мусіў быць незнаёмы маляр-італьянца, прыгаданы ў 1758 г. Калі б ён быў езуітам – было б запісана pictor noster. Зрэшты, ў езі\уітаў ніколі не было маляра-італьянца. Адзіны маляр зь італьянскім імем (Ігнат Дарэцьці) ўважаўся за чэха, бо нарадзіўся ў Празе.

1. Archiwum Romanum Societatis Iesu (далей - ARSI), Цэнтральны Архіў Езуітаў у Рыме, мікрафільмы ў Кракаве, Lith. 39-51. Не падаю старонак, бо зручна знайсьці па гадох.

2. Маю думку, што “interior tempti navis seu prima circulus” азначае “галоўную наву”, хоць тое няпэўна.

3. Напэўна, тое была Барбара з Завішаў, жонка Мікалая Фаўстына Радзівілла, памерлага ў 1746 г.

4. ARSI, Lith. 51, s. 279: arcus, qui molle sua fornici vitium fecerunt, demoliti, suffectis in eorum locum ligneis. Замена арак драўлянай канструкцыяй дазваляе дадумаць, што тут вядзецца пра дахавыя кроквы. А тыя прыбраныя аркі маглі быць кроквамі мураванымі, гэткімі як у Вільні на касьцёле сьв. Казімера, збудаваныя ў 1750 г. і існуючыя дасёньня (бачна на абмерах П. Багдзевіча ў зборах IS PAN). То бок аркі, збудаваныя ў 1753 г. ёсьць, праўдападобна, скляпеністымі гуртамі, хоць не зразумела, чаму скляпеньне закладзеная наступным годам па збудаваньні арак.

5. Дакумант фундацыйны ў ARSI, Lith. 33, s. 255-258.

6. ARSI, Lith. 51, s. 55v: Arcus ad sustentandum tectum e mura antea erecti, cum minareatur ruinum fornicibus et cubiculis infra se positis, ea propter deiecti, novoque in eorum locum sustentaculus e ligvo suscitata imbricibusque tecta. Пар. прыпіску 4.

7. Інвэнтар, напісаны люстратарамі ў 1773-74 г.г., ці г.зв. Люстрацыя, захаваўся ў Маскве, мікрафільм у Менску. Выпіскі атрымаў дзякуючы ветлівасьці пана Аляксандра Ярашэвіча.

8. Raporty generalnych wizytatorow szkol Komisji Edukacji Narodowej w Wielkim Ksiestwie Litewskim (1782-1792), Wroclaw, s. 20, 203, 239.

9. R. Mienicki, Ziemia Nowogrodzka w dobie porozbiorowej (1793-1915), Wilno, 1935 s. 8.

10. J. Bielinski, Uniwersytet Wilenski 1579-1831, Krakow 1899-1900, T.1, s. 256.

11. E. Pawlowicz, Nowogrodek w XIX wieku, Lwow 1902, s. 15 У актах Капітулы Віленскай занатавана 29 сакавіка 1801 г.: па прадстаўленьні суфр. Пільхоўскага прызначылі перадаць менш прыдатныя катэдральныя званы віленскім бернардынам, за іх сталярскія работы ў катэдры, а на месцы тых павесіць прывезеныя з наваградзкага касьцёла”. Цытата з J. Kurczewski Kosciol zamkowy czyli katedra wilenska, Wilno 1916, t.III (анатацыя актаў капітулы), s. 411. Сапраўды да 1915 г. ў катэдры быў звон, адліты ў 1753 г. для касьцёла Езуітаў у Наваградку, які важыў каля 2000 фунтаў, меўшы вышыню 77, дыяметрн 99 см. M. Brensztejn, Zarys ludwisarstwa na ziemiach b. Wielkiego Ksiestwa Litewskiego, Wilno 1924, s. 85-86.

12. R. Mienicki, op.cit., s. 66.

13. Гістарычны Архіў у Вільні, сыгнатура 567-27-25, к. 4, а таксама 567-27-33, к. 2. Перамалёўкі плянаў на кальцы даслаў мне Пан Ігар Трусаў, за што яму дзякую.

**Ежы Пашэнда, Кракаў**

**Крыніца:**
Przeglad Wshodni, tom VII, zeszyt 4(28) 2001.
(на беларускую мову пераклаў Шулаеў Андрэй)